УДК 81’282.2(476.7)

**В. М. Босак**, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар (БДТУ);
**А. А. Босак**, кандыдат філалагічных наук, дацэнт (БДЭУ);
**Ф. Д. Клімчук**, кандыдат філалагічных навук

# АСАБЛІВАСЦІ ІНАВАЦЫЙНЫХ З’ЯЎ У ГАВОРКАХ ВЕРХНЯГА НАД’ЯСЕЛЬДЗЯ

Верхняе Над’ясельдзе (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці і сумежжа) з’яўляецца ўскраінай інавацыйных з’яў, якія пашыраліся ў гэты рэгіён з двух цэнтраў: паўночнага, ці гродзенска-баранавіцкага, і паўднёвага, ці брэсцка-пінскага. Існуюць яшчэ інавацыі ўласна палескія, якія супрацьпастаўляюцца як гродзенска-баранавіцкай (панямонскай) поўначы, так і брэсцка-пінскаму (уласна загародскаму) поўдню.

The article presents the results of studies of innovation in the dialects of Verkhnyaye Nadyaseldze (Pruzhany district of Brest region and its boundary territory). Verkhnyaye Nadyaseldze is the outskirts of expansion of innovation that extends into the region from two centers: northern (Grodna-Baranavichi) and southern (Brest-Pinsk). There are also just Palessian innovations.

**Уводзіны.** На тэрыторыі Верхняга Над’ясельдзя праходзіць мяжа паміж Брэсцка-Пінскім Палессем і Беларускім Панямоннем, што дало падставу вылучыць тут 7 груп гаворак: гродзенска-баранавіцкія – на поўначы, паўночнабрэсцкія акаючыя – на захадзе, паўночнабрэсцкія окаючыя – у цэнтры, верхняясельдскія – у цэнтры, на ўсходзе і паўднёвым усходзе, малецкія – на паўднёвым усходзе, паўночназагародскія – на паўднёвым захадзе, сярэднезагародскія – на поўдні [1–3].

У кожнай мове на працягу пэўнага часу адбываліся і адбываюцца тыя ці іншыя змены, з’яўляюцца новыя рысы (інавацыі). Яны выцяснялі і выцясняюць рысы ранейшыя, архаічныя, або архаізмы. Звычайна інавацыя карэлюе з пэўным архаізмам. Фарміраваліся так званыя інавацыйныя цэнтры, дзе ўзнікалі інавацыі і адкуль яны пашыраліся, выцясняючы архаізмы. Інавацыі, якія ішлі з пэўнага цэнтра, пашыраліся на гаворкі пэўнай тэрыторыі не адначасова, а праз нейкія прамежкі часу. Таму на ўскраінах межы арэалаў інавацыйных рыс часта не супадаюць. Існуе думка, што сярод інавацый, якія пашыраюцца з пэўнага цэнтра, чым старажытнейшая інавацыя, тым большую прастору яна ахоплівае. Такім чынам, калі ўзяць шэраг інавацый, якія пашыраліся з пэўнага цэнтра, і размясціць іх у рад у адпаведнасці з той тэрыторыяй, якую кожная інавацыя ахоплівае, у залежнасці ад велічыні гэтай тэрыторыі, то, відаць, можна ўстанавіць адносную храналогію гэтых інавацый [4–6].

**Асноўная частка.** Верхняе Над’ясельдзе вылучаецца тым, што яно з’яўляецца ўскраінай інавацыйных з’яў, якія пашыраліся ў гэты рэгіён з двух цэнтраў. Першы цэнтр – паўночны, ці гродзенска-баранавіцкі, другі цэнтр – паўднёвы, ці брэсцка-пінскі або ўласна загародскі. Існуюць яшчэ інавацыі ўласна палескія, якія супрацьпастаўляюцца як гродзенска-баранавіцкай (панямонскай) поўначы, так і брэсцка-пінскаму (уласна загародскаму) поўдню.

У гэтым плане мы разгледзім некалькі фанетыка-марфалагічных з’яў, межы якіх перацінаюць Верхняе Над’ясельдзе ці яго сумежжа.

1. Рэфлекс галоснага ***о** ў пераднаціскных складах. У гаворках гродзенска-баранавіцкіх і паўночнабрэсцкіх акаючых ён перайшоў у [а] («паўночная» інавацыя), у іншых гаворках рэгіёна ***о** захаваўся (архаізм).

2. Рэфлекс галоснага ***о** ў новых закрытых складах пад націскам у гаворках сярэднезагародскіх перайшоў у [і] («паўднёвая» інавацыя), у гаворках верхняясельдскіх і малецкіх – перайшоў у дыфтонг [уо] («палеская» інавацыя), у паўночназагародскіх гаворках – перайшоў у [у] («палеская» інавацыя), у гродзенска-баранавіцкіх і паўночнабрэсцкіх гаворках на месцы ***о** вымаўляецца [о]. Праўда, існуе думка, што ў адзначаных гаворках ***о** перайшоў у [ô], а затым [ô] пад уплывам больш паўночных гаворак зноў перайшоў у [о].

3. Рэфлексы ***Ѣ** (яця) у націскным становішчы. Вымаўляўся гэты гук ва ўсходнеславянскіх гаворках прыкладна [ê] або дыфтонг [іе]. Дыфтонг [іе] (архаізм) захаваўся ў верхняясельдскіх і малецкіх гаворках. У гродзенска-баранавіцкіх гаворках, пашыраных у Верхнім Над’ясельдзі, у разглядаемай пазіцыі на месцы ***Ѣ** вымаўляецца [е] («паўночная» інавацыя), у гаворках сярэдне- і паўночназагародскіх – [і] («паўднёвая» інавацыя).

4. Рэфлексы былых «паўмяккіх» губных (***б, *в, *п**) і пярэднеязычных (***д, *т, *з, *с, *н**) перад ***е**, ***і**. На Палессі «паўмяккасць» гэтых зычных у разглядаемай пазіцыі захавалася толькі ў асобных рэгіёнах [79]. У абсалютнай большасці гаворак Палесся гэтыя зычныя вымаўляюцца або мякка, або цвёрда:

а) былыя «паўмяккія» губныя перад ***е** вымаўляюцца мякка («паўночная» інавацыя)

у гродзенска-баранавіцкіх гаворках, цвёрда («паўднёвая» інавацыя) – у гаворках паўночнабрэсцкіх, верхняясельдскіх, малецкіх, паўночна- і сярэднезагародскіх;

б) былыя «паўмяккія» зычныя ***д**, ***т**, ***з**, ***с**, ***н** перад ***е** вымаўляюцца мякка («паўночная» інавацыя) у гродзенска-баранавіцкіх і паўночнабрэсцкіх гаворках, цвёрда («паўднёвая» інавацыя) – у гаворках верхняясельдскіх, малецкіх, паўночна- і сярэднезагародскіх;

в) былыя «паўмяккія» зычныя губныя і ***д**, ***т**, ***з**, ***с**, ***н** перад ***і** вымаўляюцца мякка («паўночная» інавацыя) у гродзенска-баранавіцкіх, паўночнабрэсцкіх і верхняясельдскіх гаворках, цвёрда («паўднёвая» інавацыя) – у гаворках малецкіх, паўночна- і сярэднезагародскіх.

5. Рэфлексы мяккіх і «паўмяккіх» ***д'/*д·**, ***т'/*т·**:

а) мяккі ***д'** (архаізм) у гаворках сярэдне- і паўночназагародскіх, малецкіх захаваўся, у смаляніцкай падгрупе верхняясельдскіх гаворак перайшоў у мяккі [д$^з$] («палеская інавацыя»), у гаворках гродзенска-баранавіцкіх, паўночнабрэсцкіх і большай частцы верхняясельдскіх – перайшоў у [дз'] («паўночная» інавацыя);

б) мяккі ***т'** (архаізм) у гаворках сярэдне- і паўночназагародскіх і малецкіх захаваўся, у гаворках гродзенска-баранавіцкіх, паўночнабрэсцкіх і верхняясельдскіх – перайшоў у [ц'] («паўночная» інавацыя);

в) «паўмяккія» ***д·**, ***т·** перад ***е** ў гаворках гродзенска-баранавіцкіх і паўночнабрэсцкіх перайшлі адпаведна ў [дз'], [ц'] («паўночная» інавацыя), у гаворках верхняясельдскіх, малецкіх, сярэдне- і паўночназагародскіх ацвярдзелі («паўднёвая» інавацыя);

г) «паўмяккі» ***д·** перад ***і** ў гаворках гродзенска-баранавіцкіх і паўночнабрэсцкіх і большасці верхняясельдскіх перайшоў у [дз'] («паўночная» інавацыя), у смаляніцкай падгрупе верхняясельдскіх гаворак перайшоў у мяккі [д$^з$] («палеская» інавацыя), у малецкіх, сярэдне- і паўночназагародскіх – ацвярдзеў («паўднёвая» інавацыя);

д) «паўмяккі» ***т·** перад ***і** ў гаворках гродзенска-баранавіцкіх, паўночнабрэсцкіх і верхняясельдскіх перайшоў у [ц'] («паўночная» інавацыя), у малецкіх, сярэдне-і паўночназагародскіх ацвярдзеў («паўднёвая» інавацыя);

6. Этымалагічны мяккі ***ц'** у большасці гаворак Верхняга Над'ясельдзя ацвярдзеў поўнасцю («паўночная» інавацыя). У гаворках паўднёвых ускраін рэгёна ён ужываецца спарадычна. Сітуацыя больш складаная ў асноўным арэале брэсцка-пінскіх гаворак. Ва ўсходняй частцы арэала, пачынаючы з цэнтра Іванаўскага раёна і далей на ўсход, а зрэдку і на паўночным захадзе этымалагічны мяккі ***ц'** абмежаваны пазіцыйна. У цэнтральна-заходняй частцы арэала брэсцка-пінскіх гаворак, пачынаючы з заходняй часткі Іванаўскага раёна і далей на захад, уключаючы раён Брэста і сумежнага Падляшша, этымалагічны мяккі ***ц** пераважна захаваўся (архаізм).

7. Этымалагічныя мяккія шыпячыя і ***р'** у большасці гаворак Верхняга Над'ясельдзя ацвярдзелі поўнасцю («паўночная» інавацыя). У гаворках паўднёвых ускраін рэгёна ўжываюцца спарадычна. У асноўным масіве брэсцка-пінскіх гаворак мяккія шыпячыя і ***р'** пазіцыйна абмежаваны, у некаторых гаворках ацвярдзелі поўнасцю.

8. Формы тыпу «*ідýт, несýт /нэсýт/, хóдзят /хóдят/*» («палеская» інавацыя) характэрны для гаворак паўночнабрэсцкіх, верхняясельдскіх і малецкіх. Гаворкам гродзенска-баранавіцкім, сярэдне- і паўночназагародскім гэтая рыса не характэрна.

9. «Саканне» (формы тыпу «*купáціса, умывáюса, упрáвіласа*») («палеская» інавацыя) характэрна для гаворак паўночнабрэсцкіх, верхняясельдскіх і малецкіх. Гаворкам гродзенска-баранавіцкім, сярэдне- і паўночназагародскім гэтая рыса не характэрна.

Такім чынам, на тэрыторыі Верхняга Над'ясельдзя магчыма вылучыць тры асноўныя ачагі інавацый: «паўночны», «паўднёвы», «палескі».

**«Паўночны» ачаг інавацый:**

1. Этымалагічныя мяккія шыпячыя і ***р'** у большасці гаворак Верхняга Над'ясельдзя ацвярдзелі поўнасцю. У гаворках паўднёвых ускраін рэгёна ўжываюцца спарадычна. У асноўным масіве брэсцка-пінскіх гаворак мяккія шыпячыя і ***р'** пазіцыйна абмежаваны, у некаторых гаворках ацвярдзелі поўнасцю.

2. Этымалагічны мяккі ***ц'** у большасці гаворак Верхняга Над'ясельдзя ацвярдзеў поўнасцю. У некаторых гаворках паўднёвых ускраін рэгёна ён ужываецца спарадычна. На значнай тэрыторыі асноўнага арэала брэсцка-пінскіх гаворак мяккі ***ц'** пазіцыйна абмежаваны. У цэнтральна-заходняй частцы арэала брэсцка-пінскіх гаворак этымалагічны мяккі ***ц** пераважна захаваўся.

3. Былыя «паўмяккія» зычныя губныя і ***д**, ***т**, ***з**, ***с**, ***н** перад ***і** вымаўляюцца мякка ў гродзенска-баранавіцкіх, паўночнабрэсцкіх і верхняясельдскіх гаворках.

4. Мяккі ***т'** у гаворках гродзенска-баранавіцкіх, паўночнабрэсцкіх і верхняясельдскіх перайшоў у [ц'].

5. Былы «паўмяккі» ***т·** перад ***і** ў гаворках гродзенска-баранавіцкіх, паўночнабрэсцкіх і верхняясельдскіх перайшоў у [ц'].

6. Мяккі ***д'** у гаворках гродзенска-баранавіцкіх, паўночнабрэсцкіх і большай частцы верхняясельдскіх перайшоў у [дз'].

7. Былы «паўмяккі» ***д·** перад ***і** ў гаворках гродзенска-баранавіцкіх, паўночнабрэсцкіх і большасці верхняясельдскіх перайшоў у [дз’].

8. Галосны ***о** ў пераднаціскных складах у гаворках гродзенска-баранавіцкіх і паўночнабрэсцкіх акаючых перайшоў у [а].

9. Галосны ***Ѣ** у націскным становішчы ў гаворках гродзенска-баранавіцкіх (пашыраных у Верхнім Над’ясельдзі) і паўночнабрэсцкіх перайшоў у [е].

10. Былыя «паўмяккія» зычныя ***д**, ***т**, ***з**, ***с**, ***н** перад ***е** вымаўляюцца мякка ў гродзенска-баранавіцкіх і паўночнабрэсцкіх гаворках.

11. Былыя «паўмяккія» ***д·**, ***т·** перад ***е** ў гаворках гродзенска-баранавіцкіх і паўночнабрэсцкіх перайшлі адпаведна ў [дз’], [ц’].

12. Былыя «паўмяккія» губныя перад ***е** вымаўляюцца мякка ў гродзенска-баранавіцкіх гаворках.

**«Паўднёвы» ачаг інавацый:**

1. Былыя «паўмяккія» губныя перад ***е** вымаўляюцца цвёрда ў гаворках паўночнабрэсцкіх, верхняясельдскіх, малецкіх, паўночна- і сярэднезагародскіх.

2. Былыя «паўмяккія» зычныя ***д**, ***т**, ***з**, ***с**, ***н** перад ***е** вымаўляюцца цвёрда ў гаворках верхняясельдскіх, малецкіх, паўночна- і сярэднезагародскіх.

3. Былыя «паўмяккія» зычныя губныя і ***д**, ***т**, ***з**, ***с**, ***н** перад ***і** вымаўляюцца цвёрда ў гаворках малецкіх, паўночна- і сярэднезагародскіх.

4. Галосны ***Ѣ** (яць) у націскным становішчы ў гаворках паўночна- і сярэднезагародскіх перайшоў у [і].

5. Галосны ***о** ў новых закрытых складах пад націскам у гаворках сярэднезагародскіх перайшоў у [і].

**«Палескія» інавацыі:**

1. Галосны ***о** ў новых закрытых складах пад націскам у гаворках верхняясельдскіх і малецкіх перайшоў у дыфтонг [уо]. Роднасны яму гук [ô] пашыраны на значнай тэрыторыі арэала паўднёва-заходніх беларускіх гаворак.

2. «Саканне» (формы тыпу «*купáціса, умывáюса, упрáвіласа*») характэрна для гаворак паўночнабрэсцкіх, верхняясельдскіх і малецкіх. Пашырана на Палессі і ў некаторых сумежных абласцях (Случчына, Заходняя Гродзеншчына).

3. Формы тыпу «*ідýт, несýт /нэсýт/, хóдзят /хóдят/*» характэрны для гаворак паўночнабрэсцкіх, верхняясельдскіх і малецкіх.

4. Галосны ***о** ў новых закрытых складах пад націскам у гаворках паўночназагародскіх перайшоў у [у].

5. Мяккі ***д’** у смаляніцкай падгрупе верхняясельдскіх гаворак перайшоў у мяккі [д³].

6. «Паўмяккі» ***д·** перад ***і** ў гаворках смаляніцкай падгрупы верхняясельдскіх гаворак перайшоў у мяккі [д³].

**Заключэнне.** Верхняе Над’ясельдзе (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці і сумежжа) з’яўляецца ўскраінай пашырэння інавацыйных з’яў, якія пашыраліся ў гэты рэгіён з двух цэнтраў: паўночнага, ці гродзенска-баранавіцкага, і паўднёвага, ці брэсцка-пінскага. Існуюць яшчэ інавацыі ўласна палескія, якія супрацьпастаўляюцца як гродзенска-баранавіцкай (панямонскай) поўначы, так і брэсцка-пінскаму (уласна загародскаму) поўдню.

## Літаратура


1. Босак А. А., Босак В. М. Дыферэнцыяцыя гаворак Верхняга Над’ясельдзя. Мінск: БДТУ, 2010. 160 с.

2. Босак В. М., Босак А. А Даследаванне гаворак Верхняга // Труды БГТУ: История, философия, филология. 2013. № 5. С. 161–163.

3. Клімчук Ф. Д. Гаворкі Заходняга Палесся. Фанетычны нарыс. Мінск: Навука і тэхніка, 1983. 127 с.

4. Цыхун Г. Арэальныя аспекты фарміравання славянскіх літаратурных моў. Мінск: Навука і тэхніка, 1993. 24 с.

5. Цыхун Г. Пытанне інавацыйных цэнтраў у славянскім мовазнаўстве // Prace Slawistyczne. Nr. 114. Warszawa, 2003. С. 25–33.

6. Ossowski L. O chronologii «ciekania» i «dziekania» // Studia Slawistyctne. Wrocław-Warszawa-Kraków: Ossolineum, 1992. Z. 120–123.


*Паступіў 13.03.2014*